Лічыльнік

# ШТО ЧАКАЕ НАС СА ЖНІЎНЯ?

**З 1 жніўня адбудуцца змены, якія закрануць пенсіянераў, людзей з інваліднасцю, маці ў дэкрэтным адпачынку і некаторыя іншыя групы насельніцтва.**

## Павялічыцца бюджэт пражытачнага мінімуму (БПМ)

У Беларусі з 1 жніўня вырасце бюджэт пражытачнага мінімуму. Гэты паказчык павялічыцца да 230,92 рубля. Гэта на 6,89 рубля, або 3,1 %, вышэй у параўнанні з нарматывам, які дзейнічаў з 1 мая да 31 ліпеня гэтага года.

## Павысяцца мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі і некаторыя надбаўкі

Даплаты да пенсій непрацуючым пенсіянерам, якія дасягнулі 75 і 80 гадоў, услед за БПМ таксама вырастуць і складуць:

для 75 гадоў — 43,3 рубля;

для 80 гадоў — 57,73 рубля.

Сацыяльная пенсія інвалідам 1-й групы, у тым ліку інвалідам з дзяцінства, складзе 254 рублі;

інвалідам з дзяцінства 2-й групы — 219,37 рубля;

інвалідам 2-й групы (акрамя інвалідаў з дзяцінства), дзецям у выпадку страты карміцеля — 196,27 рубля;

інвалідам 3-й групы — 173,18 рубля;

дзецям-інвалідам да 18 гадоў пры першай ступені страты здароўя — 184,73 рубля; пры другой ступені страты здароўя — 196,27 рубля; пры трэцяй ступені — 219,37 рубля; пры чацвёртай ступені — 254 рублі.

Мінімальная пенсія па ўзросце (без уліку даплаты ў 20 % ад сярэдняй зарплаты) складзе 57,73 рубля.

## Вырастуць дапамогі на дзяцей

Павелічэнне БПМ адаб'ецца і на аднаразовай дапамозе ў сувязі з нараджэннем першага дзіцяці, якая цяпер будзе раўняцца 2309,1 рубля, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей памер аднаразовай дапамогі складзе 3232,74 рубля.

Аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, складзе 230,91 рубля.

Дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў (штомесячная) складзе 115,46 рубля.

Дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў, прадугледжаных заканадаўствам (штомесячная):

— на дзяцей, старэйшых за 3 гады, якія выхоўваюцца ў такіх сем'ях (акрамя дзяцей-інвалідаў), —115,46 рубля;

— на дзяцей-інвалідаў, старэйшых за 3 гады, — 161,64 рубля.

Дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў (штомесячная):

— з I і II ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці 18 гадоў — 230,91 рубля;

— з III і IV ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці 3 гадоў — 230,91 рубля;

— з III і IV ступенню страты здароўя пасля спаўнення дзіцяці 3 гадоў — 277,09 рубля;

— дапамога на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека (штомесячная), складзе 161,64 рубля.

## Павялічацца мінімальныя спажывецкія бюджэты

З 1 жніўня таксама павышаюцца памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў для розных сацыяльна-дэмаграфічных груп у сярэднім на душу насельніцтва і на аднаго члена сям'і рознага складу.

Памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў складуць:

для працаздольнага насельніцтва — 473,67 рубля;

для пенсіянераў — 368,92 рубля;

для студэнтаў — 349,16 рубля;

для дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — 300,01 рубля;

для дзяцей ва ўзросце ад трох да шасці гадоў — 396,92 рубля;

для дзяцей ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў — 401,54 рубля;

для сям'і з чатырох чалавек — 369,65 рубля;

для маладой сям'і з трох чалавек — 403,04 рубля.

Нагадваем, што сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек служыць асновай для вызначэння права грамадзян на атрыманне льготных крэдытаў і субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў; грамадзян, якія пастаянна пражываюць і працуюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч чалавек, — на атрыманне льготных крэдытаў на капітальны рамонт і рэканструкцыю жылых памяшканняў, будаўніцтва інжынерных сетак, узвядзенне гаспадарчых памяшканняў і пабудоў.

## Павысяцца працоўныя пенсіі і пенсіі па ўзросце

Нагадаем, што з 1 жніўня гэтага года павышаюцца пенсіі — у сярэднім на 6,6 працэнта. Сярэдні памер працоўнай пенсіі складзе 438 рублёў, сярэдні памер пенсіі па ўзросце — 446,1 рубля.

Надбаўкі, павышэнні і даплаты да пенсій будуць таксама паднятыя, але гэта адбудзецца дзякуючы таму, што паднімецца памер бюджэту пражытачнага мінімуму.

**Святлана БУСЬКО.**


**Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Гомельская область, Гомельский район, агрогородок Красное, 4 сентября 2019 года**

| Наименование объекта | Характер инженерных коммуникаций | Кадастровый номер земельного участка, адрес, размеры целевого назначения | Вещное право на земельный участок | Начальная цена предмета аукциона | Затраты, подлежащие возмещению победителем аукциона | Размер задатка, подлежащего внесению участником аукциона | Организация, предоставляющая информацию о месте размещения земельного участка, условия и порядок проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | Газопровод, электроснабжение, связь | 321084004101001045 Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома, площадь – 0,1104 га, адрес: Гомельский район, аг. Красное, ул. Трудовая, У-6 | Частная собственность | 8500,80 бел. руб. | Расходы по отводу и оформлению земельного участка, опубликованию настоящего объявления, а также расходы, связанные с проведением аукциона (сумма затрат уточняется в бухгалтерии Красненского сельского исполнительного комитета) | 850,08 бел. руб. | Красненский сельский исполнительный комитет, аг. Красное, ул. Сельсоветская, д. 12 А. Тел. 8 0232-92-35-77, тел. 8 0232-92-35-78 |

1. Аукцион состоится 4 сентября 2019 года в 14.30 в административном здании Гомельского районного исполнительного комитета по адресу: г.Гомель, ул. Ильича, д. 51а, малый зал (3-й эт.)

2. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. Аукцион проводится при двух и более участниках претендующих на участок.

Участнику необходимо подать заявление в Красненский сельский исполнительный комитет с указанием кадастрового номера земельного участка, который он желает приобрести в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Лица, желающие принять участие в аукционе к заявлению прилагают: квитанцию об оплате задатка (реквизиты платежа уточняются в бухгалтерии Красненского сельисполкома), а также предоставляют копию документа, содержащего их индикационные сведения без нотариального засвидетельствования. Представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность. При подаче документов на участие в аукционе представители гражданина предоставляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность

3. Заявление по участию в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 15.00 по адресу: Гомельская область, Гомельский район, аг. Красное, ул. Сельсоветская, д. 12а, кабинет, № 4, последний день приема документов – 03.09.2019 года до 13.00.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. При этом ему в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка.

4. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан подписать протокол аукциона, не позднее 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка, затраты на подготовку и проведение аукциона и опубликования настоящего изменения.

УНП 400226555



**ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион**

Организатор торгов: ЗАО «Белреализация» (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690-54-09, BELTORGI.BY

Продавец: ООО «Стройдормашлизинг» (УНП 190799737) в лице управляющего по банкротству ООО «Зовель», тел. +375 (29) 179-02-40 .

Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены: 9 августа 2019 г. 09.00–17.00 на электронной торговой площадке BELTORGI.BY. Предмет торгов – Шагающий экскаватор ЭШ 6,5/45-У, б/у, 1988 г. в. Начальная цена – 397 977,30 бел. руб. без НДС, шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Местонахождение – карьеры в Чашникском р-не Витебской обл., телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 18.

Для участия в торгах необходимо в срок по 8 августа 2019 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов


Чулі?!

# Мінск — зручны для турыстаў

### CNN падрыхтаваў спіс самых прыгожых еўрапейскіх гарадоў, у якіх не сустрэнеш натоўп турыстаў

**Журналісты вядомага тэлеканала назвалі дваццатку гарадоў, куды можна адправіцца ў падарожжа і не згубіцца ў натоўпе замежнікаў. У гэтым спісе гарады Францыі, Італіі, Турцыі, Балгарыі, Венгрыі, Румыніі, Грузіі, Беларусі і іншых краін.**

Пра Мінск на сайце тэлеканала сказана, што «практычна знішчаная падчас Другой сусветнай вайны беларуская сталіца стала добрай глебай для савецкай перабудовы. Сёння гарадскія будынкі прапануюць захапляльны погляд на мінулую эпоху. Вандроўцы могуць паблукаць па шырокай плошчы Незалежнасці, перш чым адправіцца ў музей Вялікай Айчыннай вайны, дзе апавядаецца пра тое, як Беларусь перажыла нацысцкую акупацыю». Таксама аўтары матэрыялу расказваюць, што ў Мінску шырокі выбар бараў. «Калі густ мясцовага бальзаму не прыйдзецца даспадобы, у Мінску можна знайсці мноства гатункаў піва, якія можна пакаштаваць пасля дня агляду славутасцяў».

У спіс CNN таксама трапілі такія гарады, як Оранж (Францыя), Норыдж (Англія), Орхус (Данія), Антверпен (Бельгія), Гаага (Нідэрланды), Сараева (Боснія), Прыштына (Косава), Мальмё (Швецыя), Абердзін (Шатландыя), Берн (Швейцарыя), Вроцлаў (Польшча), Тбілісі (Грузія), Ерэван (Арменія), Клуж-Напока (Румынія), Дэбрэцэн (Венгрыя), Анкара (Турцыя), Плоўдзіў (Балгарыя), Транхейм (Нарвегія), Турын (Італія).

# Прадстаўлены медалі Алімпійскіх гульняў 2020 года

### За год да пачатку летняй Алімпіяды ў Токіа аргкамітэт прэзентаваў узнагароды

**Яны правільнай формы, выкананы ў лаканічным і мінімалістычным стылі. Дыяметр кожнага медаля складае 85 міліметраў, таўшчыня змяняецца ад 7,7 да 12,1 міліметра. Вага залатога медаля — 556 грамаў, сярэбранага — 550 грамаў, бронзавага — 450 грамаў.**




Залаты медаль зроблены з чыстага серабра і пакрыты 6 грамамі золата. Сярэбраны медаль цалкам складаецца з чыстага серабра. Матэрыял бронзавага медаля — чырвоная латунь (95 % медзі і 5 % цынку). Для вырабу медалёў выкарыстоўваліся каштоўныя металы са старых смартфонаў, лічбавых камер і іншых электронных прылад. Улады Японіі наладзілі збор старых гаджэтаў, каб на працягу двух гадоў сабраць амаль восем тон металаў: каля 40 кілаграмаў золата, 4,9 тоны серабра і 2,9 тоны медзі. Алімпійскія гульні ў Японіі абяцаюць стаць не толькі самымі тэхналагічнымі, але і самымі экалагічнымі. Гульні Токіа-2020 пройдуць з 24 ліпеня да 9 жніўня.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Ну і ну!

# Пад выглядам элітных нямецкіх аўчарак прадаваў... дварнякоў

**Цікавую і адначасова павучальную інфармацыю размясціла на сваім сайце Група інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**



Жыхар Смаргонскага раёна 1969 года нараджэння падазраецца ў здзяйсненні ашуканскіх дзеянняў. З'яўляючыся індывідуальным прадпрымальнікам, ён займаўся развядзеннем пародзістых сабак, якіх рэалізоўваў па ўсёй вобласці. Афіцыйна афармляў дамовы куплі-продажу, плаціў падаткі, як таго і патрабуе закон. Ішоў час, і гаспадары, якія набылі шчанюкоў «нямецкай аўчаркі», зразумелі, што іх гадаванцы далёка не высакароднай крыві, а значыць, яны пераплацілі. Кошт аднаго шчанюка, дарэчы, даходзіў да 700 рублёў (у сярэднім яны каштуюць 250—370 рублёў).

Былі праведзены адпаведныя даследаванні з прыцягненнем спецыялістаў, па выніках якіх праваахоўнікі высветлілі, што мужчына проста падманваў пакупнікоў. Сваёй проціпраўнай дзейнасцю, якая налічвае вялікую колькасць эпізодаў, ён займаўся ў перыяд з 2014 да 2018 года. Па частцы 1 артыкула 209 КК РБ «Махлярства» распачата крымінальная справа.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**